# Журналістыка

*Б. В. СТРАЛЬЦОЎ*

## ГАЛОЎНЫЯ ЎМОВЫ ВЫЗНАЧЭННЯ ПРЫЯРЫТЭТНАЙ ПРАБЛЕМАТЫКІ РАЁННАГА ДРУКУ

Дыскусія па розных параметрах функцыяніравання раённага друку дасягнула высокага напалу. Найбольш актыўна яна вядзецца на старонках саюзнага часопіса «Журналист»: апошнім часам — з нумара ў нумар. Праблемы раённага звяна СМІП агалены з бязлітаснай выразнасцю: бескампрамісное падначаленне дыктату мясцовых партыйных функцыянераў (нават не ўвогуле камітэтаў, а менавіта асобных апаратчыкаў); слабая кваліфікацыя кадраў, нізкі творчы патэнцыял мясцовых журналістаў, дылетанцтва; канвеерныя метады работы — з-пад «хуткага» пяра ўсё адразу ідзе ў набор, нярэдка адзін газетчык дае ў нумар тры — чатыры рознажанравыя тэксты; надзвычай слабая зваротная сувязь паміж рэдакцыяй і чытацкай аўдыторыяй; месніцкае ігнараванне крытычных публікацый і адсутнасць рэагавання; стылёва-моўная неахайнасць, абумоўленая і спешкай, і звычайнай непісьменнасцю.

Праблемы аголены выразна. Шляхі ж карэннага пералому пакуль што не азначаны. Пошук часцей ідзе па другарадных напрамках. Прапануецца, напрыклад, раённыя газеты ператварыць у міжраённыя, удвая паменшыць газетную плошчу — з чатырохпалосак перайсці на двухпалоскі і да т. п. Не бярэцца пад увагу, што ўсё гэта ў нас ужо было ў мінулым і не дало жаданага выніку. І зараз не дасць. Агульная перабудова палітычнай сістэмы абумовіла глыбінную рэарганізацыю ўсіх звенняў журналістыкі, выпрацоўку, у прыватнасці, новай канцэпцыі раённых выданняў. Відавочна, што пачаць трэба з вызначэння статуса раённай газеты.

Істотнае адрозненне журналістыкі ад іншых сацыяльных інстытутаў у тым, што ўсе газеты, часопісы, тэлебачанне і радыё арганізацыйна звязаны з адпаведнымі партыйнымі, дзяржаўнымі, грамадскімі арганізацыямі і ўстановамі, з'яўляючыся іх органамі, г. зн. маюць свайго пастаяннага выдаўца. Для ўсіх выданняў, праўда, існуе агульная ўстаноўка — яны павінны выступаць перш за ўсё праваднікамі палітычнай лініі партыі, непахісна прытрымлівацца прынцыпу партыйнасці ў прапагандысцка-творчай дзейнасці. Такая ідэалагічная акрэсленасць тым не менш не нацэльвае журналістаў на дагматычную шаблоннасць. Наадварот, прынцып партыйнасці абумоўлівае творчую самастойнасць. Гэта ў ідэале. А на справе рэгіянальнае і ведамаснае падпарадкаванне, дыктат мясцовага выдаўца выразна, а ў шэрагу выпадкаў і даволі жорстка абмяжоўваюць журналісцкую самастойнасць.

З валявым націскам выдаўца журналісты з пераменным поспехам змагаюцца. Многае тут залежыць не так ад знешняга рэгулявання, як ад палітычнай сталасці і творчага патэнцыялу рэдакцыйнага калектыву, пазіцыі рэдкалегіі і рэдактара. А вось перад «напластаваннем» выдаўцоў рэдакцыі абсалютна бяссільныя. З гэтай зыходнай негатыўнай пазіцыі акурат і трэба пачынаць развагу, падступаючыся да распрацоўкі агульнай канцэпцыі раённага друку.

Палітычным, сацыяльным і грамадскім статусам выдаўца вызначаюцца галоўныя, прыярытэтныя напрамкі праблематыкі СМІП. Выдавец, калі можна так сказаць, заказвае музыку свайму органу. Логіка падказвае, што ў кожнай газеты павінен быць адзін выдавец. Гэтак як у «Праўды» — ЦК

КПСС, у «Комсомольской правды» — ЦК ВЛКСМ, у штотыднёвіка «Аргументы и факты» — Усесаюзнае таварыства «Веды».

На самым верхнім паверсе сістэмы СМІП логіка, як бачым, прысутнічае. Але калі спусціцца ніжэй — на рэспубліканскі ўзровень — логіка пачынае даваць збоі. «Звязда», «Советская Белоруссия» з'яўляюцца органамі адразу трох вядучых рэспубліканскіх падраздзяленняў — ЦК КПБ, Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў БССР.

Яшчэ больш складанае становішча на ніжніх паверхах, у звяне раённага друку. Гэта ўзведзеная ў квадрат складанасць тлумачыцца наперш рэгіянальнай лакальнасцю, адносінамі на ўзроўні «працягнутай рукі». І вось у такіх умовах раённая газета мае двух «гаспадароў» — раённы партыйны камітэт і мясцовы Савет народных дэпутатаў. Каму аддаваць перавагу? Якую праблематыку рабіць галоўнай, магістральнай? У прыватнасці, зараз, калі на парадак дня зноў катэгарычна выстаўлена патрабаванне: «Уся ўлада Саветам!»

Аб'яднаным жа газетам (тое ж раённае звяно) увогуле можна заблытацца ва ўзаемаадносінах са сваімі выдаўцамі. Крычаўская «Ленінскі кліч», асіповіцкая «Запаветы Леніна», напрыклад, з'яўляюцца органамі гаркомаў КПБ, гарадскіх і раённых Саветаў народных дэпутатаў (па тры выдаўцы), баранавіцкая «Знамя коммунизма», маладзечанская «Святло камунізму» — органамі райкомаў і гаркомаў КПБ, раённых і гарадскіх Саветаў народных дэпутатаў (па чатыры выдаўцы). Гэта несур'ёзна. Камандна-бюракратычнае стаўленне да прэсы, якое актыўна праявілася ў той час, калі журналісты лічыліся не раўнацэннымі ўдзельнікамі кіравання грамадскімі працэсамі, а «вінцікамі», «падручнымі», «прываднымі пасамі», па інерцыі захоўваецца. Як вынік — не толькі відавочна прытармажанае праяўленне ўласных ініцыятыў, але і расплывістасць «твару» мясцовага друку, няпэўнасць прыярытэтнай праблематыкі.

Прапануецца раённую газету зрабіць органам толькі мясцовага Савета народных дэпутатаў. Гэта, па-першае, пазбавіць рэдакцыйныя калектывы ад няпэўнасці ў адносінах з выдаўцамі, кожны з якіх сёння, як і ў мінулым, карыстаецца адміністрацыйным правам даваць газеце свае ўстаноўкі. Па-другое, акрэсліцца кола прыярытэтнай праблематыкі і ў адпаведнасці з ёю рэарганізуюцца аддзелы рэдакцый.

Адразу паўстае пытанне: якім чынам пры замацаванні газет за мясцовымі Саветамі народных дэпутатаў кампенсаваць раённым і гарадскім камітэтам партыі страту імі друкаванага органа? Заводзіць яшчэ адно выданне на раён? Безумоўна, не. Раённыя (аб'яднаныя) газеты не знаходзяцца ў ізаляцыі, яны арганічна ўваходзяць у сістэму сродкаў масавай інфармацыі і прапаганды. Таму лагічным будзе, вырашаючы іх лёс, усталяваць повязь з наступным «паверхам» сістэмы — з абласнымі газетамі. Яны таксама павінны мець аднаго выдаўца — і не абласны камітэт, а партыйную арганізацыю вобласці ў цэлым. Рэгламентацыю ж узаемасувязі паміж раённымі партыйнымі арганізацыямі і абласной газетай устанавіць не складана.

Саветы розных узроўняў выбіраюцца народам і кіруюць усімі галінамі дзяржаўнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва ў сваіх рэгіёнах. У гэту сістэму кіравання, стаўшы органамі Саветаў народных дэпутатаў, павінны па-сапраўднаму ўвайсці і рэдакцыйныя калектывы раённых газет. Асновай прыярытэтнай праблематыкі ў такім выпадку для іх стане: фарміраванне грамадскага светапогляду; усталяванне сапраўднага народаўладдзя; садзейнічанне працэсам дэмакратызацыі і забеспячэнне шырокай галоснасці; адлюстраванне і публіцыстычны аналіз практыкі мясцовага самакіравання, вядзення мясцовай гаспадаркі, развіцця сацыяльна-бытавой і культурнай сфер.

Фарміраванне светапогляду, грамадскай думкі ў друку мае яскрава азначаны прапагандысцкі аспект. Апошнім часам у нас пачалі абыходзіць гэта слова, атоесамляць само паняцце прапаганды з казённа-афіцыйным безапеляцыйным дэклараваннем лозунгаў-штампаў і абстрактных дагматаў. На самой жа справе асноўнае прызначэнне прапаганды — прывесці суб'ектыўную дзейнасць людзей у адпаведнасць з аб'ектыўнымі законамі і прагрэсіўнымі тэндэнцыямі грамадскага развіцця. Сваю прапагандысцкую функцыю нязменна ажыццяўляе друк як сацыялістычных, так і капіталістычных краін, мэтанакіравана фарміруючы грамадскую думку на ўсталяванне, абарону і развіццё канкрэтных палітычных, эканамічных, сацыяльных, прававых, этычных і эстэтычных прыярытэтаў. Менавіта гэта і з'яўляецца асяродкам кіраўніцкай дзейнасці СМІП.

Не трэба толькі рабіць вывад, што кіраўніцкая, прапагандысцкая дзей-

насць журналістаў ажыццяўляецца цалкам «зверху», пры пасіўным чаканні чытацкай аўдыторыі. Журналісцкі калектыў павінен уздзейнічаць на грамадскую свядомасць з улікам сацыяльных асаблівасцей і інфармацыйных інтарэсаў чытачоў свайго рэгіёна. І пры фарміраванні газетнай праблематыкі кіраўніцкага характару зваротная сувязь адыгрывае значную ролю.

Яшчэ большае значэнне зваротная сувязь набывае пры фарміраванні другой асноўнай плыні газетнай праблематыкі — той, якая адлюстроўвае непасрэдна чытацкія інтарэсы, прамы заказ чытачоў. Яе асяродкам з'яўляецца тэматыка, звязаная з асабістымі патрэбамі асобы, бытам, сямейным жыццём, аховай здароўя і да т. п., а таксама з задавальненнем імкнення людзей зведаць нешта незвычайнае (здарэнні, цікавыя знаходкі, анамальныя з'явы).

Арганічнае знітаванне дзвюх тэматычных плыняў (кіраўніцкай і «заказной») абумоўлівае жыццядзейнасць друкаванага органа, эфектыўнасць і дзейснасць яго функцыяніравання, масавасць і папулярнасць у чытачоў.

Такім чынам, інтэнсіфікацыю функцыяніравання раённага друку, вывад яго на ўзровень, які адпавядаў бы акрэсленай на сённяшні дзень мадэлі палітычнай сістэмы, трэба пачынаць з распрацоўкі грунтоўнай канцэпцыі мясцовых выданняў. Аснова гэтай канцэпцыі наступная: 1. Адзін выдавец (мясцовы Савет народных дэпутатаў). 2. У адпаведнасці з дзяржаўным статусам выдаўца вызначаецца прыярытэтная праблематыка (інфармацыя і прапаганда «зверху»). 3. Наладжваецца сацыялагічнае вывучэнне аўдыторыі кожнага рэгіёна, распрацоўваецца сістэма зваротнай сувязі, якая дазваляе фарміраваць і аператыўна мяняць праблематыку з улікам волі чытачоў.

*А. Г. СЛУКА*

## СУЧАСНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ДЗЕЙНАСЦІ СМІ І НЕАБХОДНАСЦЬ УДАСКАНАЛЬВАННЯ ПРАФЕСІЙНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ЖУРНАЛІСТАЎ

Аўтарытэт сродкаў масавай інфармацыі ў цяперашні час дасягнуў такой вышыні, што можна сказаць: перыяд упадку прэстыжу журналісцкай прафесіі мы перажылі.

Публіцыстыка бударажыць грамадскую свядомасць. Яна стала адной з самых моцных форм галоснасці. Узрастае і эфектыўнасць беларускіх СМІ. Значна змястоўней сталі адлюстроўваць вострыя грані перабудовы «Звязда», «Сельская газета», «Знамя юности», «Чырвоная змена», многія часопісы, рэспубліканскае радыё і тэлебачанне.

Але пры ўважлівым аналізе дзейнасці рэспубліканскіх СМІ бачны гэтакі парадокс: майстэрства журналістаў як бы адстае ад разнастайнасці жыцця. Не праяўляецца яркіх талентаў у даследаванні спецыфікі беларускай эканомікі, палітычных, навуковых і культурных праблем, асабліва такога хвалюючага ўсіх пытання, як захаванне і развіццё роднай мовы.

Ва ўсім гэтым я бачу неабходнасць перабудовы існуючай сістэмы падрыхтоўкі кадраў журналістаў у ВНУ.

Калі пачыналася рэформа вышэйшай адукацыі, вучоны Савет факультэта на аснове арганічнага спалучэння тэорыі і практыкі навучання і выхавання студэнтаў зацвердзіў новы вучэбны план. Быў скарочаны перагружаны звыш усякай меры рабочы тыдзень студэнта, скасаваны ўстарэлыя дысцыпліны, уведзены новыя курсы і спецкурсы, дзень практычных заняткаў у рэдакцыях і г. д. Зменены стыль навучання. У зносінах студэнтаў і выкладчыкаў з'явіліся прамежныя залікі, індывідуальныя кансультацыі, гутаркі. Студэнты-выдатнікі атрымалі магчымасць займацца па індывідуальнаму плану, датэрмінова здаваць экзамены і г. д. Новы вучэбны план быў заснаваны такім чынам, каб студэнты разам з выкладчыкамі інтэнсіўна здабывалі і прымнажалі веды, а пад кіраўніцтвам журналістаў у рэдакцыях авалодвалі асновамі будучай прафесіі.

Здавалася, што была знойдзена аптымальная мадэль вучобы журналістаў, тым больш, што новы план па асноўных кірунках зближаны з міжнародным узорам. Аднак жыццё паказала, што адной рэканструкцыі навучальнага працэсу далёка недастаткова для вырашэння гэтай складанай ідэалагічнай праблемы ва ўмовах абнаўлення сацыялізма. Для гэтага патрэбна сучасная канцэпцыя падрыхтоўкі і выкарыстання нацыянальных журналісцкіх кадраў, якой раней не існавалаа ні ў адной саюзнай рэспубліцы.